Практыкум па раздзеле «Беларусь і свет у XIX — пачатку XX ст.»

Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

1. 14–16 лістапада 1812 г. адбылася апошняя буйна́я бітва Айчыннай вайны 1812 г. паміж расійскай арміяй і арміяй Напалеона, якая адступала. Гэтая падзея ўвайшла ў гісторыю як бітва на рацэ Бярэзіне. Падчас гэтай бітвы Напалеон страціў больш за 20 тыс. салдат, а далейшае адступленне яго арміі ператварылася ва ўцёкі. Паражэнне ў бітве пакінула моцны адбітак у грамадскай свядомасці французаў, якія дасюль ужываюць слова «Бярэзіна» як метафару поўнага правалу або катастрофы.

Аперацыя каля Бярэзіны



Бітва пад Студзёнкай 14–16(26–28).11.1812

Некаторыя сучаснікі лічылі такі вынік выпадковым. Характарызуючы заключны перыяд Айчыннай вайны 1812 г., прускі генерал К. Клаўзэвіц адзначыў наступнае: «*Рускія рэдка апераджалі французаў, хоць і мелі для гэтага шмат зручных выпадкаў...; ва ўсіх баях французы заставаліся пераможцамі; але калі мы падвядзём вынік, дык акажацца, што французская армія перастала існаваць, а ўся кампанія завяршылася поўным поспехам рускіх, за выключэннем таго, што ім не ўдалося ўзяць у палон самога Напалеона і яго найбліжэйшых паплечнікаў. Няўжо ж у гэтым не было ні найменшай заслугі рускай арміі?*».

Пераправа цераз Бярэзіну 29 лістапада 1812 г. Мастак Ж. В. Адам. Сярэдзіна XIX ст.

Пры дапамозе дадатковых крыніц інфармацыі ахарактарызуйце:

А. Ход ваенных дзеянняў у чэрвені — верасні 1812 г.

Б. Суадносіны сіл французскай і расійскай армій напярэдадні бітвы на рацэ Бярэзіне.

В. Бітву на рацэ Бярэзіне 14–16 лістапада 1812 г.

Г. Стаўленне розных пластоў насельніцтва Беларусі да напалеонаўскіх войскаў.

Зрабіце вывад наконт таго, было паражэнне напалеонаўскай арміі заканамерным ці выпадковым.

Адрозненне факта ад думкі

2. Адмена прыгоннага права стала адной з найважнейшых падзей у Расіі ў XIX ст. Велізарная колькасць людзей атрымала, хоць і абмежаваныя, грамадзянскія правы. Вызваленне мільёнаў памешчыцкіх сялян ад прыгоннай залежнасці было крокам ад феадалізму да капіталізму.

Аднак вялікай колькасці сучаснікаў адмена прыгонніцтва здавалася памылкай. Яна выклікала крытыку як з боку памешчыкаў, так і з боку сялян.

Азнаёмцеся з вытрымкамі з дзённіка расійскага хірурга, педагога і прафесара М. І. Пірагова і адкажыце на пытанні.

М. І. Пірагоў. Мастак І. Рэпін. 1881 г.

«Грамадскую думку моцна разварушыла пытанне **эмансіпацыі** (вызваленне ад прыгнёту, залежнасці, забабонаў; у дадзеным выпадку — ад прыгоннай залежнасці). *Яно было ўзнятае, няма сумневу, зверху. Прычын да таго, як усе мы ведаем, было нямала ў той час.*

Толькі тры гатункі людзей з культурнага класа сустракаў я, што ў той час не ўхвалялі адмену прыгонніцтва: па-першае, заўзятых і непапраўных прыгоннікаў з эгаізму і асабістых інтарэсаў; па-другое, прыгоннікаў з прынцыпу. „Уся дзяржава абрынецца, — казалі гэтыя, — без прыгонных людзей".

Да трэцяга роду праціўнікаў адмены прыгоннага права належалі людзі, хоць і недабачлівыя, але не так абмежаваныя; яны вельмі наіўна сцвярджалі, што трэба перш адукаваць, а пасля вызваляць. Цікава, што і паміж самімі сялянамі, прынамсі, нашай паўднёва-заходняй ускраіны, пракідаліся праціўнікі, у тым сэнсе, што, маўляў, „няхай будзе па-ранейшаму, каб яшчэ горш не было". Гэта здаралася і мне не раз чуць. За адмену прыгонніцтва былі ўсе вучоныя, навучэнская моладзь, людзі, названыя перадавымі 1840-х гадоў; усе сяляне, не вельмі зацкаваныя, асабліва ж дваровыя, і, нарэшце, інтэлігентная і перадавая частка дваранства, якая спадзявалася са знішчэннем прыгоннага права атрымаць ад кіраўніка дзяржавы прадстаўнічы ўрад для краіны, тым болей што сам гасудар ініцыятыву эмансіпацыі клаў у рукі дваранства; гасудар жа і ягоны ўрад, зразумела, угледжвалі ў знішчэнні прыгоннага права самы галоўны і самы сучасны сродак да ўзняцця эканамічнага побыту ўсёй дзяржавы, да павелічэння яе даходаў і да збліжэння з заходнімі дзяржавамі, якое зрабілася вельмі неабходным для культуры адсталай ад Захаду ва ўсіх адносінах Расіі».

А. Якія тры групы праціўнікаў адмены прыгоннага права вылучае М. І. Пірагоў? Якія думкі выказваліся праціўнікамі адмены прыгоннага права?

Б. Якія катэгорыі насельніцтва былі прыхільнікамі адмены прыгоннага права? Чаму яны выступалі за вызваленне сялян ад прыгоннай залежнасці?

В. Параўнайце думкі наконт перспектыў адмены прыгоннага права прыхільнікаў і праціўнікаў прыгонніцтва. Абапіраючыся на

матэрыял вучэбнага дапаможніка, ахарактарызуйце фактычныя наступствы адмены прыгоннага права ў Расіі.

Г. Як вы лічыце, якіх поглядаў наконт адмены прыгоннага права прытрымліваўся М. І. Пірагоў? Сваю думку аргументуйце.

Ажыццяўленне пошуку інфармацыі

3. Прамысловая рэвалюцыя выступіла паваротным этапам у развіцці чалавецтва, аказала ўплыў на ўсе сферы жыцця грамадства. Тэмпы прамысловай рэвалюцыі паскорыліся са з'яўленнем новых відаў транспарту.

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі:

А. Даведайцеся час з'яўлення розных відаў транспарту на аснове розных тыпаў рухавікоў (не менш за 7).

Б. Дзе і калі з'явіўся першы пасажырскі транспарт? Першы пасажырскі транспарт з рухавіком? Першы пасажырскі транспарт у Беларусі?

В. Як вы лічыце, з якіх прычын дырыжаблі як паветраны транспарт саступілі месца самалётам? Пры пошуку аргументаў выкарыстайце веды па фізіцы і хіміі.

Г. Даведайцеся, калі былі пракладзены асноўныя чыгуначныя магістралі на тэрыторыі Беларусі. Як вы лічыце, як чыгуначныя лініі паўплывалі на развіццё населеных пунктаў, праз якія яны прайшлі?

Д. Размясціце знойдзеныя вамі звесткі на стужцы часу.

Устанаўленне прычынна-выніковых сувязей

4. Першая сусветная вайна змяніла аблічча свету. Дасюль вядуцца навуковыя дыскусіі наконт яе прычын, віноўнікаў, вынікаў. Прачытайце прадстаўлены ніжэй фрагмент працы ўдзельніка Першай сусветнай вайны генерала А. М. Заянчкоўскага «Сусветная вайна 1914–1918 гг.» (1924 г.). Якім чынам фактары, названыя А. М. Заянчкоўскім, маглі паўплываць на вынік Першай сусветнай вайны? Выкажыце сваю думку наконт фактараў, якія паўплывалі на вынік Першай сусветнай вайны. Дапоўніце меркаванне генерала сваімі меркаваннямі.

Фактараў, што вырашылі лёс сусветнай вайны, шмат.

1. Змены ў эканамічным становішчы Германіі... не дазволілі германскаму камандаванню ажыццявіць ідэю плана Шліфена...

А. М. Заянчкоўскі

2. Грубая палітычная памылка германскага ўрада, які не падрыхтаваў вайну супраць свайго галоўнага праціўніка — Англіі.

3. Неабгрунтаваны разлік германскага камандавання на тое, што пры дапамозе падводнай вайны яна здолее блакіраваць Англію. <...> Пры тых міжнародных эканамічных адносінах, што існавалі, Германія неабмежаванай падводнай вайной кінула выклік нейтральным краінам і выклікала новага праціўніка — ЗША.

4. Распыленне германскіх сіл і сродкаў паміж сваімі саюзнікамі, якія ўжо пасля паўгода вайны маглі трымацца толькі за кошт яе дапамогі і з свайго боку не аказвалі ёй рашучай падтрымкі...

5. Германскі ўрад і яе палітычныя дзеячы не разумелі, што пры класавых супярэчнасцях, якія абвастраюцца з прычыны эканамічнай разрухі і няўдач вайны, кінуты бальшавікамі лозунг аб перарастанні сусветнай вайны ў вайну грамадзянскую, пасля Расіі, быў асабліва блізкі да ажыццяўлення ў Германіі.

Вось тыя асноўныя фактары, у выніку дзеяння якіх сусветная вайна... набыла зацяжны характар, што, у сваю чаргу, вызначыла імавернасць яе канчатковага выніку.

Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

5. XIX ст. кардынальна змяніла жыццё чалавецтва. Але за ўсімі зменамі стаяць людзі — палітыкі, вучоныя, пісьменнікі.

А. Запоўніце табліцу «Гістарычныя асобы XIX ст.». Суаднясіце выяву гістарычнай асобы з яе імем (укажыце літару ў адпаведным слупку табліцы).

Б. Унясіце ў апошні радок табліцы характарыстыку гістарычнай асобы, якая, на ваш погляд, з'яўляецца значнай для вывучанага перыяду гісторыі.

В. Зрабіце вывад наконт ролі асобы ў гісторыі.

А

Б

В

Г

Д

Е

Ж

З

Гістарычная асоба	Літара	Гады жыцця	Дзяржава	Дзейнасць	Роля ў гісторыі
Аляксандр II					
Вільгельм II					
Джэймс Уат					
Карл Маркс					
Напалеон Банапарт					
Сімон Балівар					
Соф'я Кавалеўская					
Чарльз Дарвін					
Асоба на выбар					
Вывад					